Источник: "Народная газета" - 2012-12-14

# Книгочей

**З прапанаваных выданняў вы даведаецеся, якія вобразы адмоўна паўплывалі на свядомасць беларусаў, а таксама пра тое, што і мядзведзя часам можа выратаваць заяц.**

## Не толькі лапці ды зрэб'е

У "Беларускай навуцы" выйшаў даволі аб'ёмны зборнік "Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці", у якім змешчаны матэрыялы




міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Напрыклад, у сваім выступленні доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя звярнуў увагу на наступныя праблемы, што існуюць у сферы гуманітарных навук: "Неабходна актывізаваць укараненне ў грамадскае асэнсаванне найноўшых навуковых вынікаў гуманітарнай навукі. Адна з важнейшых задач гуманітарыяў — выяўляць балючыя і найбольш значныя сацыяльныя напружанні ў грамадстве, выпрацоўваць навукова абгрунтаваныя рэкамендацыі дзеля мінімізацыі негатыўных тэндэнцый у нашым жыцці. Сёння некаторыя айчынныя інтэлектуалы навязваюць грамадскай свядомасці ідэю пра тое, што "этнакультурная канцэпцыя" фарміравання беларускай нацыі не павінна быць базавай стратэгіяй грамадскага жыцця. Адыход ад традыцый, культурная ўніфікацыя, каштоўнасная эрозія могуць быць непрыкметнымі на першы погляд, але, па сутнасці, шкоднымі і небяспечнымі. Яны разбураюць грамадства знутры...

...Многімі дзесяцігоддзямі, а часам і сёння ў беларускай гісторыка-літаратурнай спадчыне вобраз беларуса — ахвяра цяжкага лёсу, убогая, адсталая, нікчэмная, — стаў своеасаблівай нацыянальнай прыкметай. Нават беларуская літаратурная класіка распавядала, што беларус "пан сахі і касы". Многія пакаленні беларускага народа выраслі на пастаянным і мэтанакіраваным навязванні як з Захаду, так і з Усходу комплексу непаўнацэннасці і нацыянальнай асуджанасці беларусаў, што, вядома, адмоўна ўплывала на нашу грамадскую свядомасць".

## Падарожжы па веды

Алесь Карлюкевіч прапануе малым дзеткам казкі "Як зайка Бяляк мядзведзя Таптыгіна выратаваў". Выйшла кніга ў "Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі".




Героі аўтарскіх казак вельмі любяць падарожжы. Але часам здараецца, што ў сваіх вандроўках яны трапляюць у розныя неверагодныя гісторыі. Каб выблытацца з іх, патрэбны веды з розных сфер: геаграфіі, гісторыі, фальклору і нават дакладных навук.

**Святлана ДЗЯВЯТКАВА, "НГ"**

Святлана Дзявяткава. Книгочей